View metadata, citation and similar papers at core.ac.uk
brought to you by CORE
provided by Belarusian State Pedagogical University Repository

*Т.Я.Старасценка (г.Мінск)*

## АСНОЎНЫЯ ШКОЛЫ ДЫСКУРС-АНАЛІЗУ

Тэрмін *дыскурс* звязаны з канкрэтнымі праявамі мовы, а таксама з асаблівасцямі адрасанта, адрасата і адпаведнай камукацыйнай сітуацыі. Дыскурс – своеасаблівы сінтэз двух першых кампанентаў трыяды *мова – маўленне – дыскурс*. У навуковай літаратуры разглядаюцца дзве асноўныя школы дыскурс-аналізу – англа-амерыканская і еўрапейская [3, 26 – 39].

Англа-амерыканская школа дыскурс-аналізу развівалася ў логіка-прагматычным аспекце, канцэнтруючыся на тэксце і адносінах паміж выказваннямі ўнутры тэксту. Першапачаткова аналіз дыскурсу арыентаваўся пераважна на апісанне функцыянавання мовы з пункту гледжання паслядоўнасці сказаў, трансфармацыйнай граматыкі, тэорыі маўленчых актаў. У канцы ХХ ст. дыскурсны аналіз значна пашыраецца і напаўняецца новым зместам. Дыскурс характарызуецца праз такія прыметы, як *удзельнікі*, *тэма*, *спосаб* [5]. Тэма разглядаецца М.Халідэем як сфера сацыяльнага ўзаемадзеяння, удзельнікі дыскурсу -- у сукупнасці з усімі сацыяльна значнымі адносінамі, спосаб – функцыя, якая выконваецца мовай для дасягнення пэўных мэт, канал тэкставай рэпрэзентацыі (вусны або пісьмовы), ілакутыўная мэта тэксту (тлумачальная, пабуджальная, пераканальная). Даследаваннем інфармацыйнай плыні вызначаліся працы У.Чэйфа, які значную ўвагу надаваў свядомасці, здольнай пры ўспрыманні рэчаіснасці факусіравацца на канкрэтным фрагменце свету [4]. Канцэнтрацыя свядомасці на пэўнай інфармацыі сведчыць пра яе актывацыю. Такім чынам, выяўляецца пэўная інфармацыйная мадэль дыскурсу. На думку даследчыка, вусны дыскурс узнікае не як плынь, а квантавана, адным элементам, штуршком новай інфармацыі. Вучоны ўводзіць паняцце *топіка* як сукупнасці ўзаемазвязаных ідэй (падзей, рэферэнтаў) у паўактыўным стане. Топік уключае ўсе тэматычныя асаблівасці дыскурсу. Развіццё топіка (у тым ліку і такіх яго разнавіднасцей, як другасныя і ўсечаныя) можа адбывацца ў двух напрамках – дыялагічным і наратыўным. На моўным узроўні топікі ўтвараюць фрагменты тэксту.

Еўрапейскія школы дыскурс-аналізу арыентаваліся на філасофію. Аб’ектамі крытычнага аналізу сталі не толькі пісьмовыя і вусныя тэксты, а мадэлі тэарэтычнага апісання сацыяльных структур, што дазволілі размежаваць тэкст і дыскурс. Дыскурсіўны аналіз уключаў праблемы ідэнтычнасці дыскурснай фармацыі (сэнс функцыянуе паміж пэўнымі жыццёвамі пазіцыямі), размежавання глыбіннага і паверхневага пры тэкставым аналізе (прычым “паверхневая” арганізацыя выказванняў залежная ад камунікацыйных абставін), узаемаадносін дыскурсу і грамадства (сэнс і маўленчая дзейнасць складаюць асобнае незалежнае

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

вымярэнне ў грамадскім жыцці). Такі аналіз павінен быў характарызаваць асаблівасці інтэрпрэтацыі маўлення і дзеяння ў кантэксце зносін камунікантаў.

Некаторыя навуковыя канцэпцыі ўлічвалі не толькі граматыку тэксту і прагматыку дыскурсу, але і многія сацыяльныя фактары (меркаванні і ўстаноўкі моўцаў). Напрыклад, Т. ван Дэйк разумее дыскурс як камунікацыйную з’яву, якая складаецца з працэсу стварэння тэксту і адлюстроўвае яго залежнасць ад мноства экстралінгвістычных фактараў [1]. Мадэль разумення дыскурсу ўключае і мадэль яго кагнітыўнай апрацоўкі. Дыскурс – гэта інтэрактыўная дзейнасць удзельнікаў маўлення, абмен інфармацыяй, выкарыстанне разнастайных камунікацыйных стратэгій. Даследчык разглядае дыскурс у вузкім і шырокім аспекце. У вузкім – дыскурс уяўляецца як маўленчы вынік камунікацыйнага дзеяння, г.зн. вербальны прадукт такога дзеяння. У шырокім -- гэта комплексная камунікацыйная падзея паміж адрасантам і адрасатам у працэсе камунікацыйнага дзеяння ў пэўным кантэксце (тэмпаральным, прасторавым і інш.). Канцэпцыя Т. ван Дэйка важная таму, што разглядае дыскурс у якасці складанага адзінства моўнай формы, ведаў і дзеяння. Дыскурс – своеасаблівае семантычнае адзінства, якое праяўляе найперш інфармацыйную і семантычную звязнасць. Кагнітыўна-арыентаваная традыцыя разумення дыскурснага аналізу Т. ван Дэйка значна паўплывала на распрацоўку гэтай праблемы ў айчынным мовазнаўстве.

Так, грунтоўны аналіз дыскурсу беларускіх СМІ дае В.Іўчанкаў у манаграфіі “Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту” [2]. Як зазначае даследчык, “дыскурсны падыход да вывучэння публіцыстычных матэрыялаў дазваляе ўсебакова ахапіць арыенціры на прасвятленне характару сувязей паміж рознымі кагнітыўнымі сістэмамі і ўмовамі паспяховасці маўленчых актаў у канкрэтных сітуацыях” [2, 23]. У манаграфіі падрабязна разгледжана праблема вызначэння зместу тэрміна *дыскурс*, яго структуры і залежнасцей.

У рускім мовазнаўстве, як піша Т.А.Шыраева, тэрмін *дыскурс* паслядоўна не ўжываўся амаль да канца 80-х гадоў XX ст. Аналіз дыскурсу распачаўся толькі ў пачатку 90-х гадоў XX ст. і знаходзіцца на стадыі вывучэння вопыту дыскурсіўных даследаванняў. У сваёй манаграфіі Т.А.Шыраева разглядае разнастайныя падыходы да асэнсавання гэтага паняцця [3, 36 – 39]. Так, дыскурс існуе найперш у тэкстах, за якімі паўстае асаблівая граматыка, адметная лексіка, спецыфічныя правілы словаўжывання і сінтаксісу, такім чынам – унікальны свет. У свеце ўсякага дыскурсу дзейнічаюць свае правілы сінанімічных замен, свае правілы ісціны, свой этыкет. Гэта – “магчымы (альтэрнатыўны) свет” у поўным сэнсе логіка-філасофскага тэрміна [3, 36]. Даследчыца, аналізуючы разнастайныя лінгвістычныя падыходы, знаходзіць у іх агульныя прынцыпы: статычная мадэль мовы залішне спрошчаная; дынамічная

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

мадэль мовы павінна ўлічваць камунікацыйны аспект, г.зн. сумесную дзейнасць людзей, якія імкнуцца выразіць свае пачуцці, абмяняцца ідэямі і вопытам і паўплываць адзін на аднаго; дыскурс, як і любы камунікацыйны акт, абумоўлівае наяўнасць адрасанта і адрасата, ролі якіх могуць па чарзе размяркоўвацца паміж асобамі – удзельнікамі дыскурсу; зносіны адбываюцца ў камунікацыйных сітуацыях, што павінны разглядацца ў культурным кантэксце; галоўная роля ў камунікацыйнай сітуацыі належыць людзям, а не сродкам зносін; камунікацыя ўключае дакамунікацыйную і паслякамунікацыйную стадыі; тэкст як прадукт камунікацыі мае некалькі вымярэнняў, галоўныя з якіх – параджэнне і інтэрпрэтацыя.

Такім чынам, дыскурсны аналіз, хоць і з'яўляючыся па ўспрыманні розных даследчыкаў супярэчлівым, дазваляе растлумачыць многія лінгвістычныя феномены, што дазваляе выкарыстоўваць яго дастаткова шырока. Напрыклад, пры стылістычным і філалагічным аналізе тэксту мэтазгодна звяртацца да дыялагічнага разумення дыскурсу, памятаючы, што кожны мастацкі тэкст – своеасаблівая сустрэча з іншым тэкстам. А ўчынкі персанажаў мусяць разглядацца ў дыялагічным кантэксце свайго часу як рэпліка, як сэнсавая пазіцыя. Такі падыход больш поўна выяўляе славесна-маўленчую сутнасць твора і адпаведна – вобраза аўтара.

Літаратура

1. Дейк ван, Т.А. Язык. Познание. Коммуникация / Т.А. ван Дейк; пер. с англ. – М.: Прогресс, 1989. – 312 с.

2. Іўчанкаў, В.І. Дыскурс беларускіх СМІ. Арганізацыя публіцыстычнага тэксту / В.І.Іўчанкаў. – Мінск: БДУ, 2003. – 257 с.

3. Ширяева, Т.А. Когнитивная модель делового дискурса: монография / Т.А.Ширяева. – Пятигорск: ПГЛУ, 2006. – 256 с.

4. Chafe, W. Discourse, Consciousness, and Tune. The Flow and Displacement of Conscious Experience in Speaking and Writing [Text] / W.Chafe Chicago: University of Chicago Press, 1994.

5. Halliday, M.A.K. Cohesion in English [Text] / M.A.K.Halliday, R.Hasan. – L., 1976. – 367 p.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ